НАШЫ ЧЫТАЧЫ — ПРА СВАІХ САМЫХ ДАРАГІХ ЖАНЧЫН

ЛЮБЛЮ, ТАМУ ШТО ЛЮБЛЮ!

5-гадовая мінчанка Аня ПЧАЛІНЦАВА:

— Я вельмі-вельмі люблю сваю мамачку за тое, што яна часам купляе мне ўсякую смакату.

— А калі не будзе купляць, што, не будзеш любіць? — жартам абураецца бабуля дзяўчынкі.

— Не, калі не будзе купляць, я ўсё адно яе буду любіць. Чаму? Я сказала ўжо: таму што люблю! Падару ёй на 8 Сакавіка аплікацыю. Глядзіце, мы ў садку зрабілі,— дэманструе Аня папяровыя кветачкі і адразу выпальвае завучаны загадзя віншавальны вершык са словамі: «Добра шчаслівай быць і сям'ю сваю любіць»,— але збіваецца і на хаду перарабляе:

— Каб здароўя шмат было,
Грошай многа была,
Думалі ўсе пра сям'ю
…І, канешне, пра мяне!

Ой, трэба ж яшчэ бабулі падарунак! — спахапляецца Аня.— Зараз пабягу, намалюю што-небудзь прыгожае!..

ЯНЫ — МАЁ БАГАЦЦЕ!

Загадчык нейрахірургічнага аддзялення РНПЦ «Неўралогія і нейрахірургія», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, акадэмік НАН РБ, прафесар Арнольд СМЕЯНОВІЧ:

— Мае жанчыны — аснова майго жыцця. У дзяцінстве хірургі ратавалі мне жыццё. І бабуля, і мама вельмі хацелі, каб я стаў менавіта ўрачом-хірургам. Я пайшоў у школу рана, у 6 гадоў, а таму ўжо ў 16 маці павезла мяне з Пухавічаў у Мінск, каб мы падалі дакументы ў медінстытут. Яна была побач, бо баялася, што дакументы не возьмуць. І сапраўды, іх не хацелі прымаць. Аднак у справу ўмяшаўся прарэктар па навуковай рабоце і ў той год залічылі некалькі 16-гадовых… Мая жонка — таксама ўрач. Гэта неверагоднае шчасце і шанцаванне, што я знайшоў такога чалавека… Дачка — мой гонар, выдатны спецыяліст-стаматолаг. Унучка заканчвае архітэктурны факультэт, яна выдатна малюе… Бачыце, колькі вакол мяне жанчын? Яны — маё багацце!

ЗА САМЫХ ЦЯРПЛІВЫХ!..

Начальнік упраўлення ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, палкоўнік міліцыі Дзмітрый КАРЗЮК:

— Да ўсіх самых цёплых слоў у адрас прыгожага полу я хацеў бы дадаць персанальнае віншаванне дарагім, любімым, бясцэнным ЖОНКАМ — як ад уласна інспектараў Дзяржаўтаінспекцыі, так і ад міліцыі ў цэлым. Адказная і неспакойная служба ў органах унутраных спраў патрабуе ад кожнага з нас, яе супрацоўнікаў, мужнасці і стойкасці, смеласці і знаходлівасці, гатоўнасці ў любую хвіліну дня або ночы прыйсці на дапамогу чалавеку, які трапіў у бяду. Менавіта гэтыя цяжкасці службы даводзіцца ў роўнай ступені пераносіць і жонкам нашых калег. Яны вымушаны цярпліва прымаць «дэфіцыт» нашай прысутнасці побач з імі, імкнуцца не дакараць, а заўсёды — з любоўю — падтрымліваць нас маральна. Жонкам мужчын у пагонах хачу прысвяціць такія радкі:

Женщина с нами, когда мы рождаемся,
Женщина рядом в трепетный час,
Женщина — знамя, когда мы сражаемся,
Женщина — радость наших глаз!

ДЗЯКУЙ МАЦІ, ШТО НЕ ВЫРАС БЕЛАРУЧКАМ

Дырэктар ЖЭСа № 32 ЖРЭА Заводскага раёна Мінска Міхаіл ВАРЫКАШ:

— Не адкрыю Амерыкі, калі скажу, што для мяне самымі галоўнымі жанчынамі ў жыцці сталі маці і жонка — добрая, вельмі разумная, каханая, аддадзеная паплечніца. Разам з ёю мы пераадолелі многія цяжкасці ў жыцці і адчулі шмат радасных момантаў. Жонка падарыла мне дзвюх ужо дарослых дачок. За што я ёй вельмі ўдзячны.

Мая матуля, на вялікі жаль, ужо даўно адышла ў лепшы свет… Але ўрокі жыццёвай мудрасці, якія яна выкладала мне ў маленстве, запомніліся назаўжды. Маці вучыла мяне быць добрым да тых, хто побач, спагадлівым, чуллівым да іх праблем. Яна казала мне неаднойчы: «Заўжды дапамагай людзям, і гэтае добра да цябе пасля абавязкова вернецца». Тыя словы спраўдзіліся неаднойчы. Ды і астатнім сваім жыццёвым прынцыпам я вучыўся непасрэдна ад яе.

Маці тлумачыла мне нюансы дарослага жыцця ўвесь час, пакуль я не пачаў зарабляць сабе на хлеб самастойна і пакуль мяне не прызвалі на тэрміновую службу ў армію. Дзякуючы маме я не вырас беларучкам, аранжэрэйнай кветкай. Мяне не закрывалі ад усіх цяжкасцяў і праблем навакольнага свету. Выхаванне было строгае. Калі я быў хлопчыкам, мяне не вызвалялі ад дробных работ па хатняй гаспадарцы. І, аглядваючыся назад з вышыні пражытых гадоў, разумею, што гэта была вельмі правільная і карысная методыка. На маю думку, такое стаўленне непасрэдна ўплывае на тое, якія ў цябе ў дарослым жыцці будуць стасункі з жанчынамі, адносіны да сям'і — адным словам, робіць з хлопчыка сапраўднага мужчыну, адказнага за свае паводзіны.

Часта ўспамінаецца, як ужо дарослым стараўся на выхадныя прыязджаць да яе. І шкадую, што бязлітасны час не дае магчымасці яшчэ раз пражыць тыя цудоўныя моманты…

З КІМ ТЫ ЗВЯЗАЎСЯ, ЛЁНЯ?

«Залаты голас» славутага ансамбля «Песняры», заслужаны артыст БССР Леанід БАРТКЕВІЧ:

— Самая дарагая жанчына ў маім жыцці? Жыве ў Мінску Святлана — дзяўчына, якая падарыла мне каханне, напэўна, самае першае, сапраўднае і наогул галоўнае. Я ёй вельмі ўдзячны за гэтае пачуццё, бо, калі чалавек ніколі не кахаў, ён не зможа «адбыцца», не зможа стварыць нічога вартага ў гэтым жыцці, ні праспяваць, ні сыграць… А я падарыў ёй сваю душу. Напэўна, дагэтуль яе люблю. Да сённяшняга дня мы з ёю падтрымліваем стасункі.

Зрэшты, пагаварыўшы пра высокае, артыст узгадаў іншую, ужо цалкам матэрыяльную гісторыю, звязаную «жанчынай нумар адзін» — мамай.

— Мы толькі-толькі вярнуліся з першых вялізных гастроляў — тры месяцы правялі на Далёкім Усходзе. І я прывёз проста шалёныя грошы — 5 тысяч рублёў, за якія па тым часе можна было «Волгу» набыць! Памяняў гэтую суму на дробныя грошы і паклаў на ўслончыку: у нас так было заведзена, што грошы пакідалі на бачным месцы. Мама прыйшла з працы… і расплакалася: «З кім ты звязаўся, Лёня? Дзе можна зарабіць столькі грошай?». Давялося тэрмінова тэлефанаваць Мулявіну. Ён прыехаў праз гадзіну і ледзьве пераканаў маму, што ўсё гэта сапраўды маё і зароблена сумленнай працай, што вядомыя артысты насамрэч могуць столькі атрымліваць… Памятаю, набылі тады «сценку», яшчэ нейкую мэблю, каляровы тэлевізар «Рубін». І ўсё адно гэта, лічу, толькі малая частка маёй даніны матулі: яна ж, бедная, усё жыццё паклала на тое, каб мяне вывучыць, вывесці ў людзі…

А найлепшыя свае песні, сцвярджае артыст, ён заўжды прысвячае «мілым і любімым беларускім жанчынам»:

— Каб усё добра было ў вашым лёсе, каб дзеці займаліся творчасцю і радавалі вас поспехамі, каб вам дарылі песні і казалі прыгожыя словы не толькі 8 Сакавіка, а штодня, і прызнаваліся ў пачуццях як мага часцей!

ПЕРШАЯ ЗАРПЛАТА — АД БАБУЛІ

Кіраўніца партала LADY.TYT.BY Святлана ЗЭРЭ:

— Хачу павіншаваць з 8 Сакавіка сваіх любімых маму і бабулю. Мама ў мяне самая добрая ў свеце. Усё сваё жыццё яна прысвяціла навучанню дзяцей — працавала настаўніцай пачатковых класаў. Мама ўжо 4 гады жыве ў Мінску, а прывітанні ад бацькоў яе былых вучняў прыходзяць з Бабруйска да гэтага часу... А ў бабулі самыя смачныя бліны, і яна самая чуллівая бабуля ў свеце! Яна была маім першым настаўнікам у бізнесе і ўжо з 5 гадоў вучыла зарабляць грошы. Прыводзіла мяне ў цэх на базе «Бакалея», якую ўзначальвала, там мне давалі працу на канкрэтным участку. Я цалкам сур'ёзна ўспрымала свае абавязкі і, нягледзячы на стомленасць, працавала. У канцы дня атрымлівала ў бухгалтэрыі «зарплату», не падазраючы, што... яе туды заносіць бабуля. Я была ўпэўнена, што мне плаціць дзяржава. Менавіта бабуля навучыла мяне першым фінансавым аперацыям з банкамі: дзе ўзяць грошы, куды пакласці, каб зарабіць на працэнтах. Гэтыя навыкі мне вельмі дапамагаюць у жыцці. І сёння мае мама з бабуляй — гэта каласальны рэсурс падтрымкі. Яны, калі даведаліся, што я цяжарная, набылі кватэру побач са мной у Мінску, каб быць бліжэй і ў любы момант аказаць неабходную дапамогу... Сёння, калі мы з дачкой едзем з садка, я абавязкова выконваю яе патрабаванне: «Хачу да бабусяў!». Ганаруся сваімі матуляй і бубуляй. Жадаю ім моцнага здароўя на доўгія гады! Вельмі важна, мне здаецца, выхоўваць дзяцей і ўнукаў так, каб потым яны маглі сваёй любоўю аддзячыць за такое выхаванне.

САМАЯ ПРЫГОЖАЯ, САМАЯ ЖАДАНАЯ!

Старшы афіцэр — псіхолаг агульнавайсковага факультэта Ваеннай акадэміі Беларусі Пётр ЕЎСІКАЎ:

— У выдатнае вясновае, радаснае і светлае свята — 8 Сакавіка — з асаблівай цеплынёй і сардэчнасцю хачу павіншаваць сваю жонку Волечку. Жадаю табе, любая, шчасця, здароўя, мірнага неба і ўсяго самага найлепшага. Я цябе не толькі люблю, паважаю і цаню. Я ганаруся табой! Дзякуй за тое, што ты ёсць! Дзякуй за дачку Ульяну і маленькага Ілью, якога ты падарыла мне зусім нядаўна. Дзякуй за паразуменне, падтрымку і дапамогу ў маёй нялёгкай афіцэрскай прафесіі. Волечка! Ты — увасабленне прыгажосці і захавальніца нашага хатняга ачага. Няхай цяпло і святло тваёй усмешкі, твая сардэчнасць, вернасць і пяшчота стане крыніцай усіх радасцяў у нашай сям'і. Ты для мяне самая прыгожая, разумная і жаданая. Са святам цябе, каханая!

ЗА ГРОШЫ НЕ КУПІШ

Дэкан факультэта прафесійнага развіцця спецыялістаў адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, доктар псіхалагічных навук, прафесар Уладзімір ЯНЧУК:

— Я ўдзячны табе, адзінай, за ўсё, што не купіш ні за якія грошы. За цеплыню хатняга ачага, за клопат і падтрымку ў цяжкія хвіліны, шчырае і спачувальнае раздзяленне горычы паражэнняў і раптоўных удач, за бескарыслівую радасць маім перамогам, за тую надзейную апору, якую ты прадастаўляеш у складаны час, за падушку, у якую можна паплакацца... За дзяцей, якія дораць нам абаім радасць і ўпэўненасць у будучыні... За ўсё тое, што не можа даць нават самая шчырая мужчынская дружба... За жаноцкасць, дзякуючы якой я не перастаю адчуваць сваю мужнасць і запатрабаванасць!

■ Мужчынская логіка

ЧЫЁ СВЯТА, ТОЙ І СВЯТКУЕ

8 сакавіка. Метро. Дзяўчына гадоў дваццаці заходзіць у вагон. Яна бачыць перад сабою стройны шэраг мужчын, якія занялі абсалютна ўсе месцы для сядзення на бліжэйшай лаўцы. У аднаго з «седакоў» у руцэ — свежанькія цюльпаны, у другога — прыгожа запакаваная скрыначка з бантам і ружа, трэці нешта хаваў за пазухай, астатнія ўтаропілі вочы ў свае мабільнікі. І ўсё было б нармальна. Але ж дзяўчына ні з пушчы ні з поля выпаліла на ўвесь вагон: «Ну што, хлопцы, са святам вас!»

Дык сапраўды ж гэта наша свята, хлопцы! Найкаштоўнейшае сярод усіх! Самі паглядзіце: мы ж толькі ў гэты дзень заўважаем нашых дзяўчат. І як тое цудоўна! Немагчыма ж налюбавацца — гэткія яны прыгожыя ды ладныя! І глядзім, глядзім на іх бясконца і верна, на кожную — як на адзіную. І ўсмешкі ў нас адразу разыходзяцца не тое што да вушэй, але і на патыліцы завязваюцца. І рукі цягнуцца да падарункаў. І на язык кладуцца адно толькі кампліменты (няхай сабе і як сякерай высечаныя, але ж шчырыя). Няўжо ж не свята для нас уся гэта прыгажосць? Зразумела, што самае натуральнае. Мы святкуем прасвятленне, адкрыццё… У каго гэта язык павярнуўся назваць такі дзень жаночым? Га? Наша свята, і толькі наша! Бо нарэшце ўспамінаем, што можам нечым дапамагчы нашым маці, жонкам, дочкам (а мы ж можам, бо мы — мужчыны!), напрыклад, талерачку памыць ці каструльку патрымаць.

Альбо хаця б месца ў транспарце разочак саступіць. Вось уявіце: усё тое ж самае метро. Звычайным днём у перапоўнены вагон зайшла цяжарная жанчына. І з-за недахопу месца ўстала наўпрост насупраць нейкага хлопца, што сядзеў на крайнім месцы вялікай лаўкі. Хлопец адвёў вочы. Натуральна: ён, відаць пачаў збірацца з духам, назапашваць смеласць, скрэбці рэшткі годнасці, каб велічна, па-мужчынску ўстаць і прапанаваць сваё месца гэтай жанчыне. Восьвось бы гэта адбылося. І ўвесь вагон аглух бы ад авацый у адрас гэтай высакароднасці… Аднак не склалася. Жанчына, што сядзела побач з ім, хуценька паднялася, і на яе месца праціснулася цяжарная пасажырка.

А потым яны яшчэ будуць казаць, што свет перакуліўся дагары нагамі, што мужчын сапраўдных няма. А адкуль мы возьмемся, калі і подзвіг учыніць не даюць? Таму застаецца толькі спрадвечнае жаданне пахваліцца чым-небудзь перад сябрамі ў мужчынскай кампаніі. Толькі хваліцца сёння сапраўднаму мужчыну няма чым. Замест таго, каб расказваць адзін аднаму аб прыгажосці, дабрыні, розуме сваёй дзяўчыны, мы дзелімся (ды яшчэ з падрабязнасцямі) тым, як угаварылі яе на самі ведаеце што пры першай жа сустрэчы. І чуем у адказ ухвальнае: «А-а-а, мужык!», «Ну, ты круты!» і гэтак далей…

Таму 8 Сакавіка — гэта наша свята. Пакіньце яго нам, жанчыны. У вас жа ёсць яшчэ цэлы год.

***

«А што было з тымі мужыкамі, што сядзелі?» — магчыма, спытаеце вы. Яны, безумоўна, падскочылі адразу. Бо сапраўдныя, годныя мужчыны. Як тыя вожыкі, што, вядома, з'яўляюцца вельмі годнымі птушкамі,— пакуль не пхнеш, не паляцяць…

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■ Нефармат

«ПРАГУЛКА» БЕЗ РОЗЫ І КЛАРЫ

Не ўспомню, колькі гадоў таму, але дакладна больш за дзесяць, да мужа зайшоў калега па нейкай справе. А паколькі на календары быў жаночы дзень, то госць палічыў патрэбным аддаць дань ветлівасці. *«Віншую вас з Восьмым мартам!»* — гукнуў мне літаральна з парога наведвальнік. З вуснаў цалкам беларускамоўнага чалавека гэты «Восьмы март» прагучаў неяк іранічна, з намёкам на безнадзейную застарэласць, «савецкасць» свята. Пра штучнасць, надуманасць, «за вушы прыцягнутасць» гэтага дня даводзіцца чуць цяпер літаральна кожную вясну.

І колькі камянёў было кінута апошнім часам у бок Клары Цэткін і Розы Люксембург! А заадно даставалася Інэсе Арманд і Веры Слуцкай, бо яны заснавалі свята, яны змагаліся за правы жанчын і іх міжнародную салідарнасць. Палымяным рэвалюцыянеркам не даравалі ні партыйнай і ідэйнай барацьбы, ні тым больш іх асабістых раманаў з таварышамі па партыі. І вось ужо, аказваецца, змагаліся яны не за тое і дабіліся не таго. Пра гэта, прынамсі, піша вядомы брэсцкі журналіст і блогер: «Адным з патрабаванняў раўнапраўя была роўная зарплата. Але ніхто не ўспамінае, чаму пры праклятым царызме мужыку плацілі больш. Мелася на ўвазе, што мужчына ўтрымлівае сям'ю. Напрыклад, у настаўніка была павышаная зарплата, таму што мелася на ўвазе, што грошай яму павінна было хапіць на ўтрыманне жонкі, дзяцей і адной служанкі. Лічылася: калі жанчына працуе, яна — незамужняя, бяздзетная, ёй нікога, акрамя сябе, утрымліваць не трэба, таму грошай ёй плацілі менш»... У выніку масавага фемінісцкага руху жанчыны дабіліся роўных правоў, занялі трывалую пазіцыю ў грамадстве, перасталі нараджаць дзяцей і тым самым паставілі пад пагрозу існаванне белай расы. Так сцвярджае аўтар. Смела, але небясспрэчна.

Бадай што пры вялікім жаданні можна было б знайсці ў гэтых разважаннях пэўную логіку, але мне здаецца, што мужчыны самі, нават не без некаторага задавальнення, аддалі нам гэтыя правы. Найперш, каб зняць з сябе пэўныя абавязкі па ўтрыманні той жа сям'і. Ці многа сёння сярод мужчын знойдзецца ахвотных цалкам узваліць на свае плечы матэрыяльную і маральную адказнасць за дом, у якім гаспадарыць шчаслівая непрацуючая жонка і мітусіцца шмат дзяцей? Вось ад гэтай печкі я і прапанавала б танцаваць шматлікім крытыкам жаночага свята.

Калі на тое пайшло, то і не трэба нам ваш дзяжурны «Восьмы март» з сухаватай мімозай і саладкаватымі прамовамі. Як казала адна мая знаёмая: «Я гатова святкаваць нават дзень Парыжскай камуны, калі толькі муж прынясе мае любімыя ружы». Вось дзе цяпер код гэтага свята. За сто гадоў мы і забыліся пра яго паходжанне, сэнс, ідэйную накіраванасць. Засталіся вясна і спрадвечнае чаканне цяпла, абнаўлення, чагосьці добрага і светлага. І кожная жанчына, што б яна там ні казала, чакае слова, кветкі, верша ці нейкага іншага знака ўвагі. Калі ж каму катэгарычна не падабаецца 8 Сакавіка, можна прыдумаць свой дзень — восьмага красавіка, мая, чэрвеня, ліпеня. Магчыма, гэта будзе яшчэ больш рамантычна. Але чым тады горшы дзень Восьмага сакавіка?

Аднойчы ў гэты дзень недалёка ад майго прыпынку грамадскага транспарту давялося назіраць не зусім звычайную карціну. На высакаватым люку гарадскіх ачышчальных збудаванняў бамжаватага выгляду мужчына і жанчына пілі таннае віно, разліваючы яго ў пластыкавыя кубкі. «Што тут незвычайнае?» — спытаеце вы. Цяпер такіх людзей за падобным заняткам можна сустрэць, дзе хочаш. А незвычайнае было тое, што выглядалі яны абсалютна шчаслівымі. Пра нешта ажыўлена гаварылі, смяяліся, не заўважалі нікога і нічога навокал. Каб не лахманы ды сінюшны колер твараў, можна было б прыняць іх за экстрэмалаў-дзівакоў, што такім экстравагантным чынам вырашылі адзначыць свята альбо прыцягнуць да сябе ўвагу. Але гэта былі сапраўдныя бамжы, толькі... надзвычай шчаслівыя. Падумалася тады, што ў тым і сэнс любога свята, любога віншавання, каб зрабіць шчаслівым таго, каго віншуеш. Шчаслівым хоць на дзень, на гадзіну, а то і на хвіліну. І для гэтага неабавязкова згадваць гісторыю або падводзіць ідэалагічную базу. А калі без ідэалогіі ніяк, то Розу і Клару я прапанавала б пакінуць у спакоі. Яны яго заслужылі. А эмблемай свята зрабіла б карціну Шагала «Прагулка». Гляньце на яе — і ўсё зразумееце...

Святлана ЯСКЕВІЧ

ЧАРОЎНАЕ Ў ЗВЫЧАЙНЫМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У калгасе працавала на розных участках. Гадавала дзяцей. А потым здарыўся Чарнобыль. Іх населены пункт трапіў ў зону забруджвання. Тамара Уладзіміраўна з дзецьмі выехала, а муж некаторы час нават кіраваў брыгадай ліквідатараў наступстваў аварыі. Трэба было заворваць забруджаную зямлю. Потым паўстала пытанне, куды ехаць на новае месца жыхарства. Выбралі Брэст, бо Тамара родам з Драгічынскага раёна. Цяпер яна гаворыць, што вельмі пацягнула на радзіму. Заўсёды, відаць, так бывае, калі напраўдзе нейкая бяда.

У Брэсце для вучоных-аграномаў работа знайшлася. А калі выйшлі на пенсію, з'явіўся час для рэалізацыі сваіх хобі. Муж Пётр Мацвеевіч заняўся вырошчваннем саджанцаў пладова-ягадных культур, а яна робіць паштоўкі.

Яны проста не ўяўляюць, як можна жыць на пенсіі, нічога не рабіць і лічыць капейкі ад аднаго чысла месяца да другога.

Захапленне паштоўкамі прыйшло выпадкова. Паспрыялі стасункі са сваякамі і сябрамі з Францыі, ЗША, Польшчы, Расіі. На кожнае свята існавала велізарная праблема знайсці добрыя паштоўкі на беларускай мове.

Першыя паштоўкі былі выраблены цалкам самастойна, кожная — у адным экзэмпляры. Але іх аўтар заўважыла, што паштоўкі падабаюцца і беларускім сябрам, знаёмым і нават незнаёмым людзям. Тады нарадзілася ідэя рабіць больш паштовак і прадаваць іх. Для гэтага спатрэбілася ліцэнзія Міністэрства інфармацыі. Каб яе атрымаць, неабходна здаць экзамен. І спачатку аўтара эксклюзіўных паштовак гэта насцярожыла, яна як быццам адмовілася ад ідэі. Але па вечарах нешта ціхенька пачытвала, ніхто з сямейнікаў не надаваў гэтаму асаблівага значэння. А потым заявіла, што едзе ў Мінск атрымліваць ліцэнзію. І праўда, перад камісіяй міністэрства засведчыла неабходны ўзровень ведаў і атрымала дазвол на прадпрымальніцтва.

У яе захапленні Тамару Уладзіміраўну падтрымалі ўсе трое яе дзяцей і ўнукі. Шукалі мастакоў, абмяркоўвалі сюжэты і подпісы да кожнай паштоўкі. Так нараджаліся мілыя карцінкі пра каханне з подпісамі накшталт «Верабейчык, не сумуй» або «Цалуй мяне яшчэ часцей». Такія паштоўкі нярэдка дапамагаюць прыдумваць дзеці. Дачка Алена з мужам прыдумалі цікавы сюжэт з сэрцам на светлым фоне. Сэрца складаецца са слоў, якія вызначаюць асноўнае слова «каханне». Гэта, напрыклад, вершы, пачуцці, музыка, цуд, свабода, дотык і многае іншае. Ёсць забаўныя, цікавыя, крыху наіўныя і, разам з тым, мілыя: «Спяшаюся да цябе», «Я хварэю без цябе», «Для цябе ўсё самае смачнае». На адной з картак абдымаюцца два коцікі, а надпіс гаворыць: «Усё будзе добра». Хто не захацеў бы атрымаць навагодняе віншаванне, дзе на паштоўцы вялікімі літарамі напісана: «У Новым годзе шчасце ў модзе»? А каханым можна адпраўляць паштоўку штодня: з'явілася серыя з сямі штук на кожны дзень тыдня.

Паштоўкі Тамары Бахун прадаюцца ў мінскіх крамах «Белкніга», «Акадэмкніга», «Кніжны салон», іх можна замовіць праз групы «Беларускія паштоўкі» ў сацыяльных сетках. Каштуе адна паштоўка каля 10 тысяч рублёў. У Брэсце яны прадаюцца ў ЦУМе. На ЦУМаўскай вітрыне маю ўвагу адразу прыцягнула ўсмешлівая прыгажуня, якая сядзіць на воблачку з надпісам: «Адшукай чароўнае ў звычайным». Падумалася, што гэта і ёсць крэда Тамары Уладзіміраўны. Менавіта яна адшукала ў прыгажосці роднага слова натхненне на цікавую і патрэбную справу.

Тады нарадзілася ідэя рабіць больш паштовак і прадаваць іх. Для гэтага спатрэбілася ліцэнзія Міністэрства інфармацыі. Каб яе атрымаць, неабходна здаць экзамен. І спачатку аўтара эксклюзіўных паштовак гэта насцярожыла.

— Наконт мовы нават пытання не стаяла, — гаворыць выдавец арыгінальнай серыі. — Мы з самага пачатку вырашылі займацца толькі беларускай паштоўкай. Няпраўда, што мовай не цікавяцца. Добра, напрыклад, ідуць паштоўкі са словам «Дзякуй». Паспрабавалі прадаваць сваю прадукцыю ў адным з кіёскаў Белаазёрска. Там на ГРЭС працуе група кітайскіх рабочых. Яны купляюць мае паштоўкі і пасылаюць іх дадому. Расіяне любяць сюжэт пра «Жи» і «Ши» з літарай «ы». Ну а беларусы шукаюць тое, што найбольш адпавядае іх уласнаму светаўспрыманню.

Клопату ў Тамары Бахун як індывідуальнага прадпрымальніка хапае з той жа бухгалтэрыяй, справаздачнасцю. Але Тамара Уладзіміраўна любіць, каб усё было па правілах і ў адпаведнасці з законам: «Прыбытак невялікі, а любыя непрыемнасці альбо непаразуменні з падатковымі ці іншымі органамі лічу для сябе недапушчальнымі. Таму, як старанная вучаніца, усё пішу, падлічваю, афармляю ў тэрмін, паводле інструкцый».

Робяцца новыя эскізы, ідзе пошук далейшых рынкаў збыту. Далёка не ўсе гандлёвыя арганізацыі адважваюцца браць такі спецыфічны тавар. Я пацікавілася, ці ёсць яе паштоўкі ў сувенірных крамах Брэсцкай крэпасці. І Тамара Уладзіміраўна падзякавала за ідэю: там жа штодня бывае шмат турыстаў. Чаму ж не прапанаваць ім своеасаблівы тавар?

Раней аўтар гэтых радкоў зусім не цікавілася выставамі альбо парадамі рэтрааўтамабіляў. Не разумела, што за асалода аднавіць фактычна са звалкі машыну, якой паўвека ці больш. Пакуль аднойчы не пачула, як аматар рэтра тлумачыў свой інтарэс. Ён казаў, што сучасныя аўтамабілі выйшлі з канвеера, які абслугоўваюць у асноўным робаты. А ў старых машынах адчуваецца душа інжынераў, якія іх стваралі, а таксама рабочых, якія складалі кожны аўтамабіль сваімі рукамі. Так і тут: здавалася б, што асаблівага ў звычайнай паштоўцы? А ў ёй душа адчуваецца. Яна радуе, вось як гэта «Адшукай чароўнае ў звычайным». Тамара Уладзіміраўна раіць яе паштоўкі падпісваць рукой і тым самым дарыць іншаму чалавеку часцінку сваёй душы.

Яна СВЕТАВА.
Фота з архіва Тамары БАХУН.